# РЭФАРМАВАННЕ СІСТЭМЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТ.

**А.В. Валеўка**
*старшы выкладчык кафедры канстытуцыйнага права і дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»*

Значным дасягненнем дзейнайсці сойма 1764 г. было стварэнне цэнтралізаванай сістэмы кіравання гаспадарчай дзейнасцю і фінансамі. У мэтах павышэння эфектыўнасці выканаўчай улады былі створаны дзве скарбовыя (фінансавыя) камісіі для Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) і Польшчы на чале з падскарбіямі. Сойм утварыў таксама вайсковую камісію, але толькі для Польшчы. Чартарыскія не захацелі абмяжоўваць уладу гетмана ВКЛ М. Масальскага, які падтрымліваў на той час «фамілію».

Пастановы канвакацыйнага сойма адносна грашова-фінансавай палітыкі дзяржавы мелі адной з асноўных мэтаў абмежаванне ўлады падскарбіяў. Для гэтага былі створаны спецыялізіраваныя калегіяльныя органы – скарбовыя камісіі. Для ВКЛ была ўтворана Эканамічная рада літоўскага скарбу, якая таксама мела назву Скарбовая камісія ВКЛ. У тэксце соймавай канстытуцыі «KomissyaSkarbyW. X. Lit.» адзначалася мэта стварэння Скарбовай камісіі ВКЛ: «як найлепей арганізаваць парадак Літоўскага скарбу і памножыць яго даходы праз увядзенне лепшага кіравання» [5].

Рашэнні на пасяджэннях камісій прымаліся большасцю галасоў, што выключала магчымасць аднаасобнага прыняцця пастаноў адносна сбора і размеркавання дзяржаўных даходаў [1, с. 185]. Пастановай сойма замацоўвалася, што пры выкананні сваіх службовых паўнамоцтваў камісары Эканамічнай Рады былі абавязаны клапаціцца пра інтарэсы дзяржавы, а не пра свае ўласныя інтарэсы, не атрымліваць іншай платы, акрамя пэўнай дзяржавай за іх службу, і ва ўсіх справах кіравацца аб'ектыўнасцю і справядлівасцю [3, с.129]. Ужо ў першыя этапы сваёй дзейнасці скарбовыя камісіі паказалі сябе вельмі перспектыўнымі органамі дзяржаўнага кіравання. Так, згодна са справаздачай, якая адбылася на сойме 1766 года, у дзяржаўную казну паступіла 13 731 тыс. злотых, з іх доля Скарбовай камісіі складала 5 111 тыс. злотых [1, с. 186]. Да ўтаварэння скарбовых камісій даходы дзяржавы складалі каля 325 тыс. злотых. Увядзенне Генеральнай мытні і фінансавых камісій у Кароне і ў Літве паклала пачатак рэфармаванні фінансавай сістэмы Польшчы, якая сфармавалася ў «саксонскі перыяд» і зацверджанай канстытуцыямі 1717 г. на «нямым сойме». Фармальна каронная фінансавая камісія пачала працаваць з 1 ліпеня 1764 года, а літоўская - толькі 1 сакавіка 1765 г.

Канвакацыйны сойм ліквідаваў прыватныя пошліны і ўстанавіў «галоўную пошліну», аднастайную і абавязковую для ўсіх жыхароў дзяржавы, не выключаючы шляхту, святарства і самога караля. Такім чынам падаткі абавязаны былі выплачваць усе катэгорыі насельніцтва. Мясцовыя падаткі былі

ліквадаваныя, акрамя падатку на ўтрыманне дарог і мастоў, аднак і яны спаганяліся з абмежаваннмі. Змены таксама адбыліся і ў адносінах габрэйскага насельніцтва. Падатак за агульную колькасць габрэяў быў адменены, а замест гэтага яны павінны былі плаціць падушны падатак [3, с. 186]. Адбыліся і пэўныя змены ў адносінах да гарадоў: на іх карысць стала абкладацца падаткамі не толькі мяшчанства, але і шляхта, маючая тут нерухомасць. Сойм ліквідаваў абавязак мяшчан выдзяляць бясплатна кватэры паслам на сойм і ўдзельнікам шляхецкіх з’ездаў.

Ліквідаваліся ўсе прыватныя мытныя пункты і пошліны, і ўводзілася так званая генеральная пошліна, якую са спецыяльнай інструкцыяй абавязаны былі плаціць усё, пачынаючы ад караля і кожнага шляхціца да купца і селяніна [4]. Ад выплаты новай пошліны вызваляліся толькі шляхецкія тавары, якія перавозіліся з аднаго валодання ў іншую ці на торг, а таксама тавары, што ўвозіліся з-за мяжы, але толькі ў тым выпадку, калі перавозчык (шкіпер) прысягне, што тавар прызначаны для яго ўласных патрэб, а не для продажу [4].

Не ўся шляхта станоўча адносілася да рэфармавання сферы фінансаў і гандлю. І. Кітурка прыводзіць прыклад са Жлобінскай ярмаркі. Пры правядзенні кірмашоў у Жлобіне права спаганяць мыта ад купцоў меў рэчыцкі маршалак пан Халецкі, і на падставе гэтага яго камісар запатрабаваў ад Ю. Арамовіча так званую салюцыю - плату за пагаршэнне становішча ў памеры 75 злотых для пана Халецкага і 15 злотых для сябе [2, с. 130]. Супэрінтэндант Рэчыцкай Каморы не мог наважыцца на выплату такіх грошай і адправіўся з данясеннем ў Гродна, аднак па шляху сустрэў рэчыцкага маршалка, «меў з ім сур'ёзную размову», але пан Халецкі адказаў, што прыняць рашэнне можа толькі на месцы. У выніку па прыездзе ў Жлобін Ю. Арамович за дазвол правесці дагляд купцоў вымушаны быў заплаціць пану Халецкаму 80 рублёў і яго камісару 6 злотых з дзяржаўных грошай, каб з-за страчанага часу скарб не панёс яшчэ большых страт [2, с. 130]. На ўсіх гарадскіх варотах Жлобіна суперінтэндант расставіў стражнікаў для ажыццяўлення дагляду і праверкі належных дакументаў, каб тавары не перамяшчаліся без выплаты пошліны. Пры гэтым Ю. Арамовіч паведаміў у Скарбовую камісію аб інцыдэнце, які меў месца. Калі шляхціц Дамінік Маліноўскі са сваім слугой Тадэвушам Пшыгодскім хацелі праехаць праз аддаленыя вароты з нейкім таварам, стражнік адмовіўся іх прапусціць, паколькі яны не прад'явілі спецыяльны знак на права праводзіць воз, які павінны былі атрымаць у горадзе. У адказ на гэта «стражнік атрымаў ад пана Маліноўскага ўдар у галаву, а затым быў моцна збіты » [2, с. 130]. Гэтая сітуацыя выразна паказвае нам узнікшае падчас рэфармавання сутыкненне паміж новымі поглядамі на дзяржаўную рэчаіснасць і шляхецкай ідэалогіяй. Многія прадстаўнікі шляхты не ўспрымалі сур’ёзна тыя змены ў дзяжаўным і грамадскім жыцці Рэчы Паспалітай, якія адбываліся ў другой палове XVIII ст. Моцная дзяржаўная ўлада ўспрымалася пануючым саслоў’ем як пагроза іх прывілеяванаму стану.

Пачаўшыяся вельмі аптымістычна, рэфармацыйныя намаганні, аднак, з цягам часу прыходзілі ў заняпад. Гэта было выклікана таксама і супярэчнасцямі паміж Чартарыйскімі і каралём Станіславам Аўгустам наконт некаторых пытанняў. Асабліва гэта тычылася фінансавай рэформы. Адным з напрамкаў фінансавага аздараўлення Рэчы Паспалітай павінна было стаць утварэнне Манетнай камісіі, якая займалася пытаннямі чаканкі новай дзяржаўнай манеты. Гэтая рэформа павінна была забясбечыць фінансавую бяспеку Рэчы Паспалітай і спыніць выкарыстанне замежнай манеты [3, с. 187]. Аднак на шляху ўдасканалення грашовай сістэмы дзяржавы рэфарматары сутыкнуліся с шэрагам супярэчнасцяў. Розныя пазіцыі былі наконт месца чаканкі новай манеты. У якасці такіх разглядаліся: Варшава, Гданьск, Торунь і Эльблонг. Была створана Манетная камісія для ўрэгулявання пытанняў фінансавай рэформы. Галоўнай задачай яе дзейнасці быў выпуск новай манеты. Гэта тлумачылася неабходнасцю ўстанаўлення адзінай агульнадзяржаўнай манеты і спынення чаканкі мясцовай манеты ў Польскай Прусіі. Рэформа была таксама накіравана супраць хаджэння ў краіне замежнай манеты і ўцечкі срэбра за мяжу з-за неадпаведнасці курса польскага злотага і рэальнага ўтрымання срэбра ў манеце. Гэта праблема асабліва абвастрылася ў гады Сямігадовай вайны, калі Прусія выпусціла вялікую колькасць «дрэнны манеты» з паніжаным утрыманнем серабра. Нарэшце, чаканка новай манеты ў Варшаве павінна была не толькі папоўніць дзяржаўную казну за кошт регальных прэрагатыў кароны, але і падняць аўтарытэт Станіслава Аўгуста сярод шляхты.

Сваю працу манетная камісія пачала ў студзені 1765 г. і выказалася ў пачатку за захаванне права чаканкі сярэбраных грошай у Гданьску і Торуні, а медных – у Эльблонга. Прычым новая каралеўская манета не павінна была па змесце срэбра істотна адрозніватцца ад манеты Каралеўскай Прусіі або Курляндыі. Вясной 1765 г. гарады Каралеўскай Прусіі пагадзіліся з гэтай прапановай, але з умовай, што яны атрымаюць права чаканіць такую ж уласную манету.

Аднак неўзабаве камісія змяніла сваё рашэнне. Манету было вырашана чаканіць у Варшаве, а яе выраб даручыць прускаму банкіру Швейгерту, які меў канторы ў Берліне і Пецярбургу і хацеў узмацніць пазіцыі свайго банка, удзельнічаючы ў правядзенні грашовай рэформы ў Польшчы.

Станіслаў Аўгуст падпісаў кантракт са Швейгертом. Аднак, як успамінаў сам кароль, зроблена гэта было ў адсутнасць М. Чартарыскага, пасля вяртання якога супраць кантракту выступілі Я. Борха і А. Пшаздзецкіх, а таксама С. Любамірскіх. Яшчэ раз выявіўся канфлікт паміж «старымі» членамі «Фаміліі» і “сябрамі” караля. У снежні 1765 года праект Швейгерта быў адкінуты, а Станіслаў Аўгуст вымушаны быў пагадзіцца з кампрамісным варыянтам праекта Я. Борха і зацвердзіў рашэнне камісіі аб выпуску новай манеты [3, с. 186].

Праекты пераўтварэння дзяржаўных фінансаў сустрэлі моцнае супраціўленне як унутры краіны, так і з боку суседніх вялікіх дзяржаў,

галоўную ролю сярод якіх у гэтым адыграла Прусія. Як адзначае Б.У. Носаў, «уплыў знешняга фактару абцяжарвае адказ на пытанне, наколькі разгледжаныя фінансавыя рэформы былі абумоўлены сацыяльна-эканамічным ладам польскага грамадства другой паловы XVIII ст., а наколькі былі навеяны моднымі еўрапейскімі тэорыямі, аднак варта прызнаць, што вылучэнне падобных праектаў сведчыла аб усведамленні найбольш перадавой часткай польскіх магнатаў неабходнасці новых сучасных спосабаў дзяржаўнага кіравання, на што і была накіравана палітыка «Фаміліі» [3, с. 187].

Меры па ўпарадкаванні дзяржаўнага бюджэту Польшчы і яе грашовай сістэмы, абвешчаныя канвакацыйным соймам і ажыццёўленыя ў 1765-1766 гг., не толькі істотна папоўнілі дзяржаўную казну, але і ўтрымлівалі ў сабе спробу новага падыходу да дзяржаўных фінансаў: у пэўнай меры абмяжоўвалі падаткавыя імунітэты і прывілеі шляхты як пануючага саслоўя.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. –Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII ст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2007. – 344 с.

2. Китурко, И.Ф. Скарбовая комиссия ВКЛ и реорганизация таможенной службы в 1765 – 1772 гг. / И.Ф. Китурко // Гістарычна-археалагічны зборнік / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі; пад рэд. А.А. Кавалені, В.В. Даніловіча [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 129 – 139.

3. Носов, Б.В. Установление российского господства в Речи Посполитой. 1756 – 1768 гг. / Отв. ред. В.К. Волков. – М.: Индрик, 2004. – 728 с.

4. Korzon Tadeusz Wewnetrzne dzieje Polski za Stanislawa Augusta (1764 – 1794) badania historyczne ze stanowiska ekonomicznego i administracyjnego T.4 / T. Korzon. - Kraków : Księgarnia L. Zwolińskiego i S-ki ; Warszawa : nakł. Księgarni Teodora Paprockiego i S-ki, 1897. – 339 s.

5. Komissya Skarby W. X. Lit. / Volumina legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – T. VII. – L. 75-78.

## ДЕКОНСТРУКЦИЯ ПОНЯТИЯ ПРАВОВОГО СОЗНАНИЯ В КОНТЕКСТЕ ПОСТНЕКЛАССИЧЕСКОЙ НАУКИ И ЕЕ ПРАКТИЧЕСКОЕ ЗНАЧЕНИЕ

**И.Л. Вершок**
*доцент кафедры теории и истории государства и права юридического факультета Белорусского государственного университета, кандидат юридических наук, доцент*

Определение правосознания в юридической литературе традиционно сводится к перечислению различных его внешних проявлений, в качестве которых выделяются эмоции, чувства, идеи, акты признания или непризнания права. При наличии отрицательных оценок, связанных с действующим правом,